**Афганская** спякота ў памяці назаўсёды / падрыхт. К. Рынкевіч // Міёрскія навіны. — 2023. — 14 лют. — С. 1, 3.

**АФГАНСКАЯ СПЯКОТА Ў ПАМЯЦІ НАЗАЎСЁДЫ**

**На чорна-белым, крыху выцвілым ад часу фотаздымку малады хлопец на танку. Фонам мясцовасць, падобная да пустыні. Гэта Афганістан, ваколіцы Кабула. Тут праходзіў тэрміновую вайсковую службу ўраджэнец вёскі Бычыншчына Мікалаёўскага сельсавета Алег ШУПЕЙКА.**



**Добраахвотна ў гарачую кропку**

**ДЛЯ ВЯСКОВЫХ ХЛОПЦАЎ У ПАЧАТКУ 80-Х СЛУЖЫЦЬ У АРМІІ БЫЛО СПРАВАЙ ГОНАРУ**. Алег Шупейка марыў апрануць форму салдата ваенна-марскога флоту. Накіравалі ў паветрана-дэсантныя войскі.

– Да арміі скончыў вучылішча ў Боркавічах і год адпрацаваў трактарыстам у калгасе «1 Мая». Прызываўся ў 1981-м. Памятаю дзень, калі поштай прыйшла павестка, – расказвае Алег Пятровіч. – З Віцебска накіравалі ў вучэбку ў літоўскае месцейка Гайжунай. Там прымаў прысягу. Вывучыўся на механіка-вадзіцеля самаходнай артылерыйскай установкі. Гэта машына, падобная да танка. Напісаў заяву прадоўжыць службу ў Афганістане. Рашэнне прымаў сам, як і ўсе мае таварышы па службе. У Кабул прыбылі ў красавіку 1982-га. Службу неслі за горадам, ахоўвалі аэрадром, хадзілі на баявыя заданні.

**Далёкія фотаімгненні**

Размаўляем з воінам-інтэрнацыяналістам ва ўтульным доме ў Бычыншчыне. Сціплую бацькоўскую хатку Алег Пятровіч разам з жонкай Нінай Мікалаеўнайператварылі ў прасторнае камфортнае жыллё. Любяць тут гасцяваць іх браты і сёстры, ёсць дзе размясціцца дарослым

сынам, калі наведваюцца дадому, хораша з татам і мамай малодшай дачушцы-дзевяцікласніцы Насці.

**РАЗГЛЯДАЕМ ЧОРНА-БЕЛЫЯ ЗДЫМКІ, НА ЯКІХ ЗАСТЫЛІ ДАЛЁКІЯ ІМГНЕННІ АРМЕЙСКАЙ СЛУЖБЫ.** На агульным фота пасля прысягі ў Гайжунаі былы вайсковец не адразу знаходзіць сябе. На наступным здымку – ужо з Афганістана – ён з таварышам **Аляксандрам** з расійскага горада Кальчугіна Уладзімірскай вобласці. Пасля той прыязджаў да сябра ў Беларусь на вяселле. Яшчэ адно фота: салдаты ля танка на фоне афганскіх гор. Гэтыя фатаграфіі Алег Пятровіч праяўляў з негатываў дома пасля дэмабілізацыі. Яму пашчасціла вярнуцца адтуль, дзе кожны новы дзень мог стаць апошнім.

**Гучала гітара, і раптам – абстрэл**

– Відаць, лёс аберагаў, – заўважае суразмоўнік. – Неяк у ноч з 8 на 9 мая адзначалі Дзень Перамогі. Ціха было, спакойна, гітара гучала. Я на браню танка прылёг, мне саслужывец кажа: «Ідзі да механіка адпачні». Толькі пайшоў – абстрэл пачаўся, і па танку, дзе я ляжаў, трапіла. Двойчы на расцяжку натыкаўся. Зачапіў, калі пайшлі ў кішлак з маладым байцом. Ён паспеў крыкнуць: «Кладзіся!» Ніхто ад выбуху не пацярпеў. Пашанцавала і ў другі раз. Толькі калі падаў, руку аб камень парэзаў. Больш перажываў, ці паспелі маладыя легчы, з якімі разам былі. Устаём – усе ў парадку.

**АД ТЫХ ПАДЗЕЙ АЛЕГА ПЯТРОВІЧА АДДЗЯЛЯЮЦЬ СОРАК ГАДОЎ**. У памяці назаўсёды шатры з буржуйкай, у якіх жылі да трох дзясяткаў чалавек; спякотнае афганскае лета з тэмпературай за +30 удзень і золкімі начамі; слотная зіма з бруднымі дарогамі, на якіх часам буксавала тэхніка. Аднойчы з-за гэтага на тыдзень салдаты засталіся без харчавання. Даядалі сухары, зерне ў кішлаку знаходзілі.

– У цэлым кармілі нармальна. Летам збіралі грэцкія арэхі і вінаград, чаго там шмат. Мясцовыя жыхары часам ляпёшкамі частавалі. Пастаянным пунктам у меню быў чай з вярблюджай калючкі, што засцерагала ад тыфу і дызентэрыі, – расказвае суразмоўнік. – Пастаянна салодкага хацелася. Раз на месяц давалі згушчанае малако, баначку адразу выпіваў. І ў Новы год гэта быў самы смачны ласунак.

**Друкаванае пісьмо**

**НОВЫ 1984 ГОД АЛЕГ ШУПЕЙКА СУСТРАКАЎ ДОМА**. Вярнуўся ў пачатку снежня 1983-га. З радасцю абдымалі бабуля, бацькі і малодшая сястра. З Афганістана пісаў ім пастаянна. Аднойчы прыйшло ў Бычыншчына пісьмо, у якім прагладаліся друкаваныя літары праз канверт. Родныя ўскрывалі яго з трывогай. Аказалася – ліст-падзяка бацькам за сына, які годна нёс службу. Пасля маці з гордасцю паказвала яго аднавяскоўцам. Тое пісьмо ў сямейным архіве не захавалася, засталіся медаль «Ад удзячнага Афганскага народа» разам з юбілейнымі.

У ліку ўзнагарод Алега Пятровіча – ганаровая грамата і медаль ад Міністэрства лясной гаспадаркі. 38 гадоў працуе ў Дзісненскім лясгасе. Пачынаў слесарам, большы час – машыніст тралёвачнай машыны. Два гады таму стаў лаўрэатам звання «Чалавек года Міёршчыны».

**Калі ажывае мінулае**

**ДЗЕНЬ 15 ЛЮТАГА ДЛЯ АЛЕГА ПЯТРОВІЧА НЕ ПРОСТА ЧАРГОВАЯ ДАТА Ў КАЛЕНДАРЫ.** Ажываюць успаміны, ляцяць думкі ў армейскае мінулае. Пры магчымасці едзе ў Міёры на мітынг ушанаваць памяць усіх, хто служыў у Афганістане і чыё жыццё абарвалася сярод пяскоў і гор.

Расказаць пра службу воіна-інтэрнацыяналіста запрашалі ў Дзісненскую школу. Самае частае і па-дзіцячаму наіўнае пытанне вучнёўскай аўдыторыі: «Ці было страшна?»

Канешне было. І гэта зразумела, – сумна ўсміхаецца суразмоўнік. – Небяспека ўвесь час побач. Аднак стараліся шмат пра гэта не думаць. Можа быць, да канца не ўсведамлялі тое, што адбывалася. Маладыя былі. Час доўга цягнуўся. Іншым пра ўсё не раскажаш, а хто служыў, той ведае.



Фота з архіва Алега ШУПЕЙКІ.